## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**В. І. Уткевіч**

# УКАРАНЁНАСЦЬ ЯК ВЫЗНАЧАЛЬНЫ ПРЫНЦЫП АРХІТЭКТОНІКІ «ПАЛЕСКАЙ ХРОНІКІ» І. МЕЛЕЖА

Укаранёнасць як тэарэтычная катэгорыя для характарыстыкі, у тым ліку і мастацкага выяўлення нацыянальнага быцця, сёння шырока выкарыстоўваецца не толькі айчыннымі, але і шматлікімі еўрапейскімі навукоўцамі. У дадзеным артыкуле даецца вопыт канкрэтнага яе выкарыстання для літаратуразнаўчага аналізу «Палескай хронікі» І. Мележа і яе кампазіцыйнай пабудовы. Матыў укаранёнасці вызначальны для І. Мележа на ўсіх узроўнях: сюжэтным, жанравым, характаралагічным, ідэйна-канцэптуальным. Катэгорыя ўкаранёнасці дае магчымасць тэкстуальна выявіць канцэптуальную аснову счаплення падзей і лёсаў герояў у раманах «Палескай хронікі», знайсці законы, што кіруюць лабірынтамі счапленняў, паглядзець на твор праз новую літаратурна-крытычную перспектыву.

Напісаныя ў сярэдзіне XX ст. раманы «Людзі на балоце» (1962), «Подых навальніцы» (1966) і надрукаваны ў 1978 годзе трэці незавершаны раман «Завеі, снежань» у свой час былі ўспрыняты літаратурна-крытычнай і грамадскай думкай як глыбока праўдзівыя творы аб калектывізацыі. Вобраз жа Васіля Дзятла ўспрымаўся як характар у значнай ступені абмежаваны ўласніцкімі супярэчлівасцямі. Вось што пісаў вядомы крытык Дз. Бугаёў: «Іван Мележ вельмі ўважлівы да трагічных перажыванняў Васіля Дзятла, у якога ёсць свая, няхай і абмежаваная, у канчатковым выніку асуджаная гісторыяй, але ёю ж і ўзрошчаная праўда, выпакутаваная жывым чалавекам» [1, с. 107]. А ў якасці характараў пазітыўнай скіраванасці ў той час былі асэнсаваны перш за ўсё так званыя «пераўтваральнікі»: камуніст Апейка, куранёўскія актывісты Міканор, Хоня, Алеша, Грыбок. Вось толькі некалькі прыкладаў з літаратуразнаўчых прац: «Міканору, які паказаны верным сынам народа, выпала нялёгкая, хоць і пачэсная місія ўзначаліць перабудову Куранёў на новы лад жыцця» [2, с. 114], або: «На жаль, такіх, як Міканор, Хоня, Алеша і Грыбок у Куранях усё-такі адзінкі» [3, с. 105]. У манаграфіі Ф. Куляшова «Подвиг художника», якая была выдадзена якраз у тыя гады, акцэнты расстаўлены яшчэ больш яўна: «Миканор выдвинул идею строительства гребли, он повел агитацию за осушение болота, он объединил вокруг себя молодежь и мужественно вступил в единоборство с темнотою и религиозными суевериями, хорошо понимая, что осушить “болото невежества” ничуть не легче, чем осушить болото на Полесье» [4, с. 99].

Прайшоў час, змены ідэалагічных матрыц грамадскага жыцця і грамадскай думкі абумовілі новыя, нават супрацьлеглыя ацэнкі тых жа характараў. Напачатку XXI ст. час высветліў іншае. «Асабліва выразна раскрываецца жорсткасць, нялюдскасць Міканора, – адзначае В. Ляшук, – які не прытрымліваецца ні запаведзі Бібліі, ні спрадвечнай народнай маралі. Калі Міканор не лічыцца з просьбай маці, не ўважыў ні адну яе просьбу, то чаго маглі чакаць ад яго чужыя людзі… Не дай бог мець такога сына, для якога самыя

блізкія – абыякавыя. Быццам так і трэба: сесці за стол, не спытаўшыся, ці елі бацькі, не звярнуць увагі, што маці сядзіць склаўшы рукі на грудзях, як нябожчык, не супакоіць, не прылашчыць, проста не пагаварыць, а спакойна жаваць, выціраць сала хлебам і даядаць» [5, с. 169].

Такі расклад меркаванняў і змена пунктаў гледжання – вынік трансфармацыі метадалогіі на рубяжы стагоддзяў. Сацыяльныя крытэрыі і прынцыпы саступілі месца пошуку агульначалавечых каштоўнасцей у падыходзе да твораў нацыянальнай літаратуры мінулых часоў. Гэткая трансфармацыя дыскурсу набірае не толькі хуткасць, але і садзейнічае яго пераарыентацыі. Нельга не пагадзіцца са слушнай заўвагай А. Яскевіча: «Вядомыя эстэтычныя пераарыентацыі і пераацэнкі мастацкіх каштоўнасцей у сённяшнім памежна ўзрушаным свеце, якія ў нядаўна прамінулы, бурна падзейны рубеж другога тысячагоддзя вымагаюць ад нас, побач з усімі іншымі аспектамі літаратуразнаўчых даследаванняў, абачлівага тэарэтычнага паглыблення і ўзмацнення падвалін нацыянальнай літаратуры, нарошчвання яе патэнцыяльнасці для паўнамоцнага ўваходжання ў абноўленую гістарычную перспектыву нязведана ўскладненай зямной цывілізацыі» [6, с. 206].

Мележазнаўства адрэагавала на змену ідэалагічных матрыц імгненна, і тады значнае месца заняло даследаванне нацыянальнага характару, вытокаў нацыянальнай ментальнасці, пошук каранёў народнага быцця на прыкладзе шэрагу герояў, характараў і лёсаў, прадстаўленых у мележаўскай літаратурнай спадчыне.

Укаранёнасць, менавіта як тэарэтычная катэгорыя, сёння шырока выкарыстоўваецца не толькі айчыннымі, але і шматлікімі еўрапейскімі навукоўцамі для характарыстыкі ў тым ліку і мастацкага выяўлення нацыянальнага быцця. Уласна тэарэтычны аспект гэтай праблемы распрацаваны намі ў манаграфіі «Ідэя ўкаранёнасці ў мастацкім асэнсаванні беларускай літаратурай канца XIX – пачатку XX стагоддзя» [7]. У дадзеным артыкуле даецца вопыт канкрэтнага яе выкарыстання для літаратуразнаўчага аналізу «Палескай хронікі» І. Мележа і яе кампазіцыйнай пабудовы.

Матыў укаранёнасці вызначальны для Мележа на ўсіх узроўнях: сюжэтным, жанравым, характаралагічным, ідэйна-канцэптуальным. Можна сказаць, што менавіта праз ідэю ўкранёнасці адбываецца рух аўтарскай думкі ад побыту да быцця. Пачнём з прысвячэння рамана «Людзі на балоце»: «Бацьку, маці, роднай зямлі». Успрыняцце зямлі і яе ўсведамленне ў кантэксце з самымі значнымі для кожнага чалавека словамі *бацька* і *маці* ўзвышаюць, асвячаюць яе, выключаючы з шэрага блізкароднасных сінонімаў – *глеба*, *поле*, *ніва* – і ўздымаючы да такіх паняццяў, як *бацькаўшчына*, *радзіма*, *айчына*, *выток* і *крыніца жыцця*. Канцэпт зямлі як канцэпт свабоды быў вызначаны яшчэ класікамі нацыянальнай літаратуры Я. Коласам, М. Гарэцкім, К. Чорным. Менавіта ў працы на зямлі раманісты бачылі асноўны абавязак чалавека, яго пазітыўную сутнасць. Катэгорыя зямлі набывае ў беларускай літаратуры асаблівы статус філасофскай, становіцца катэгорыяй духоўнага плана.

Зварот пісьменніка да Палесся невыпадковы не толькі па знешнебіяграфічных акалічнасцях. Палессе на сённяшні дзень асэнсавана беларускімі этнографамі, фалькларыстамі і філосафамі як нацыянальны сімвал. Наступная ступень рэалізацыі ідэі ўкаранёнасці як анталагічнага падмурку твора – агульная назва трох раманаў. «Палеская хроніка» – мастацкая выява рэгіёна ў гісторыі, або гісторыі ў рэгіёне. Неабходна адзначыць, што ўнікальнасць Палесся, ідэнтыфікацыя яго як беларускай зямлі паўплывала на ўспрыманне краіны ўвогуле, надала яе вобразу адметнасць і своеасаблівасць. Акрамя таго, для беларусаў неабсяжныя балоты і непраходныя лясы ва ўсе гістарычныя часы рабіліся сховішчамі, дзякуючы якім яны здолелі выратавацца ад варожай навалы падчас войнаў і іншых сацыяльных катаклізмаў. Менавіта яны дазволілі нашаму народу пазбегнуць міграцый, якія не абмінулі некаторыя іншыя славянскія народы. Вось чаму ўяўляецца несумненным той факт, што балоты і пушчы як нацыянальны ландшафт у пэўным сэнсе прадвызначылі асабліва моцную прывязанасць народа да сваёй зямлі, а гэта знайшло сваё адэкватнае адлюстраванне ў беларускай літаратуры.

Адметнасць Палесся паўплывала на вобраз усёй краіны шмат у чым дзякуючы геніяльнаму палешуку І. Мележу, трылогія якога пра гэтую частку беларускай зямлі перакладзена на 23 мовы. Адзін з перакладчыкаў Мележа на эстонскую мову О. Йыгі так тлумачыць сваю цікавасць да трылогіі: «Мяне вабілі сур'ёзнасць і глыбыня, з якой аўтар раскрывае гістарычны лёс свайго народа, вабілі незнаёмае асяроддзе, нейкі асаблівы каларыт рамана, глыбокае веданне аўтарам сваіх герояў, адсутнасць спрашчэння ў адлюстраванні складанага, поўнага вострых канфліктаў часу» [8, с. 217].

Другі бок эпапеі – хранікальнасць. Пра неабходнасць маштабнага погляду на пераломныя падзеі XX ст. у лёсе чалавека і нацыі І. Мележ пісаў яшчэ задоўга да пачатку працы над ёй. «Напісаць вялікую рэч пра тое, як мянялася і ламалася псіхіка беларускага селяніна з 1914 да нашага дня. Пражыты страшэнна жорсткія, ломкія гады. Этапы – 1914, 1917, 1921, 1926, 1930, 1937, 1941, 1945. Ісці недалёка за вобразамі – узяць жыццё бацькі, маткі. Наступленне на балота – вялікая прыгожая нацыянальная тэма» [9, с. 9]. Хоць, дарэчы, час, калі гэта было напісана, мала спрыяў нацыянальнаму падыходу да пералічаных эпахальных падзей, аднак І. Мележ ужо тады, як бачым, думаў глыбока нацыянальна, таму трылогія і набыла маштаб народнай эпапеі. У свой час А. Адамовіч паставіў хроніку Мележа ў адзін шэраг з «Вайной і мірам» Л. Талстога, а яшчэ называў яе беларускай сястрой «Ціхага Дону». А. Ганчар, вядомы ўкраінскі празаік, ва ўспамінах пра І. Мележа «Цудоўны чалавек і пісьменнік» называе «Палескую хроніку» «велічнай сагай народнага жыцця» [10, с. 98]. Такім чынам, трылогія Мележа як з пункту гледжання простых чытачоў, так і з пункту гледжання навукоўцаў-літаратуразнаўцаў – твор, які глыбока раскрывае ўкаранёнасць чалавека ў нацыянальную глебу. Гэта сага, эпапея, шматпланавы і шматнаселены твор, які адрозніваецца асаблівым псіхалагізмам у раскрыцці характараў – тыпаў.

М. Стральцоў слушна адзначыў, што ўжо першы раман «Людзі на балоце» «матэрыялам сваім і характарам "счаплення" гэтага матэрыялу належыць да класічнай раманнай схемы, што трымаецца на раўнавазе псіхалогіі і быту, лакалізаваных яшчэ і этнаграфічна» [11, с. 153]. Катэгорыя ўкаранёнасці дае магчымасць тэкстуальна выявіць, відавочна прааналізаваць канцэптуальную аснову гэтага счаплення. Знайсці законы, што кіруюць лабірынтамі счапленняў, падмурак усёй эпапеі і кожнага рамана паасобку, а гэта значыць паглядзець на твор па-новаму, праз новую літаратурна-крытычную, абумоўленую ўсё ж такі сацыяльна, перспектыву, бо агульныя героі і гістарычная аснова яднаюць раманы толькі знешне, фабульна.

Мастацкае майстэрства І. Мележа ў «Палескай хроніцы» агульнавядома і добра вывучана. Пластыка слова, стыль, праўдзівасць, рэалізм аповеду такія, што, як і ва ўсякім сапраўдным мастацкім творы, знікае ўражанне створанасці. Форма настолькі злітая з сутнасцю, што яе элементы не адчуваюцца, створана ілюзія жывой непасрэднай плыні жыцця. Убачыць у гэтай плыні жыцця аўтарскі разлік, наўмыснасць, нават канцэпцыю, даволі складана. Паказальны адзін факт з літаратурнага жыцця тых гадоў. Іван Мележ у артыкуле «Раман і яго праблема» такім чынам выступіў у абарону свайго рамана «Людзі на балоце»: «Вялікі скептык нашых дзён Барыс Бур'ян выказаў сумненне ў тым, ці ёсць канцэпцыя ў некаторых нашых творах, у прыватнасці, і ў "Людзях на балоце". Як чалавек, што цікавіўся гэтай з'явай, павінен сказаць: ёсць. Думаю нават, што канцэпцыя павінна быць у аснове кожнага сур'ёзнага твора. А інакш – грош цана» [12, с. 267]. Гэтую канцэпцыю, на нашу думку, і можна назваць укаранёнасцю, яна вызначае характар счаплення сюжэтаў, герояў і падзей. Вядучая калізія, што ідзе ад эпохі, заключана ў наступным: немагчыма знішчыць укаранёнасць беларуса-селяніна, у прыватнасці – палешука, у структуры спрадвечнага, застылага ў сваёй патрыярхальнай непарушнасці быцця, на кавалку зямлі, з усіх бакоў сціснутай балотамі, і ад гэтага амаль роднаснага і неаддзельнага ад уласнага цела. Хоць такі *modusvivendi* – гэта, па сутнасці, выжыванне на грані магчымага: «Вам у лапцях, наскрозь прамоклых, па сырым халодным балоце на сабе вязкі галля даводзілася цягаць? Даводзілася на адной печанай бульбе і без солі цэлымі тыднямі жыць? Даводзілася на чужога дзядзьку за бясцэнак працаваць ды яшчэ яму ў ножкі за гэта кланяцца?» [13, с. 299].

Вытокі ўкаранёнасці нацыянальнага характару ў хранатопе як структурнай аснове рамана ўдала знойдзены І. Мележам. У першым, самым сімвалічным рамане «Людзі на балоце» гэты ўнікальны хранатоп набывае бачнасць. «Балоты і выспы сярод бясконцых багнаў, дзікіх зараснікаў, што разлегліся на сотні верст з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход», – такая прастора. «Усё было найбольш звычайнае. Як і летась, і пазалетась, і ўсе гады, якія помніліся Васілю, зарастала раскай цёплая, з душным балотным смуродам нерухомая вада ў лужынах, у сажалках, у затоках» [14, с. 35] – гэта час. Матыў нязменнасці, вечнасці быцця палескай вёскі-выспы шматразова падкрэсліваецца ў рамане «Людзі на балоце» у розных абставінах і з рознай нагоды.

Увесь шматнаселены мастацкі свет «Палескай хронікі»: сяляне, людзі «з раёну», пераўтваральнікі – увасоблены на высокім мастацкім узроўні з яркай індывідуалізацыяй мовы, асобы, лёсу, псіхалогіі, сацыяльных і нацыянальных вытокаў кожнага характару. А мэта адна – агульны закон счаплення: ірвецца шматвяковая ўкаранёнасць нацыянальнага быцця ў зямлі, а яна – крыніца жыцця, лад яго, узаемаадносіны аднавяскоўцаў, каханне. У кожным лёсе – драматызм і трагедыя: ад Карча да Зайчыка, задача ж пісьменніка – матываваць гэты драматызм і трагедыйнасць на ўзроўні нацыянальных па ўкаранёнасці і ўніверсальных па сутнасці страсцяў эпохі. Выйсці на палескі побыт, які напачатку ХХ ст. існаваў даволі схавана, амаль у першаснай патрыярхальнай форме, выявіць сутыкненне яго з сацыяльнай рэвалюцыяй – калізія сапраўды на ўзроўні гамераўскага эпасу, дзе лейтматывам гучыць лёс, наканаванасць, непазбежнасць.

Сілавое поле аўтарскай думкі, у якім падаецца кожная сацыяльная або асабістая падзея ў жыцці герояў «Палескай хронікі», ахоплівае не толькі Курані, а ўздымаецца «над» імі: з вышыні гістарычных прычын і следстваў даносіць дасведчаны погляд на дзіўныя падзеі. Так, першым подыхам таго, што блізіцца новы час, стала з’яўленне ў Куранях бандытаў – такога не было раней, гэта недапушчальна па народных маральных законах. З-за трагічнай памылкі невінаватай ахвярай робіцца Васіль, і на гэтай памылцы завязваецца будучая калізія рамана. Вобраз Васіля трапляе тут у шэраг архетыповых у багатай мастацкай літаратуры аб калектывізацыі ад А. Платонава да М. Шолахава: невінаваты, але маўклівы, які не вымавіць ні слова ў сваё апраўданне, селянін-«злодзей».

Эпапейны ўздым аўтарскай задумы дыхае ў кожным вобразе, падзеі, нават у з’явах прыроды, распрацаваных да сімвалізму: зламаны навальніцай крыж, разбуранае гумно, дзе голыя сохі на зары, што нагадваюць абрубкі залітых крывёю чалавечых рук.

Таксама ў гэтай сувязі хацелася б звярнуць увагу на пачатак другога рамана хронікі – «Подых навальніцы». Перш чым апісваць звычайны летні дзень у Куранях, Мележ нібы набірае дыстанцыю і падае яго з пункта гледжання мінулага, робіць рэтраспектыўны дыскурс у лакальную гісторыю. Такі прыём М. Бахцін называў дыстанцыяваннем эпасу, яго неабходнай аддаленасцю ў памяці і завершанасцю: «Потым, з гадамі, з мудрай далечы людзі не раз прыгадвалі гэта лета. Тады ж нікому не думалася, што дням гэтым суджана запомніцца, надоўга асесці ў людской памяці» [15, с. 9]. Усё, што далей пададзена як пейзаж – гэта ўжо другаснае асэнсаванне ў памяці, у чалавечым мысленні. Што ж падкрэсліла гэтая другаснасць? Моцнае жаданне, каб усё і было менавіта «звычайна» (словы *звычайна*, *заўсёдна* ў невялікім кавалку тэксту сугестыўна прысутнічаюць у кожным радку). «Усё было, здавалася, звычайнае, будзённае, наладжанае. Звычайныя былі раніцы і вечары, звычайныя, заўсёдныя – учарнелыя хаты і гумны, заўсёдныя – зазелянелыя, у векавечных струпах моху, стрэхі. Нічым не адметная вуліца з рудым пылам ды каравячымі бебакамі, нязменныя агароды

з гурочнікам ды піякамі, нязменныя загуменні з трухою леташняй саломы; звычайныя палі-загоны са звычайнай зелянінай, звычайны лес навокал, звычайныя балоты – і тыя, што за агародамі, і тыя, што за лесам. Звычайнае, здавалася, было лета. Яшчэ адно лета, адно з многіх, якія ўжо зведалі ў спрадвечным клопаце Курані. Яшчэ адно на доўгай, няспыннай дарозе, каляіны якой выразаны вякамі і, здавалася б, на вякі» [16, с. 9]. У гэтым урыўку проста фізічна, слыхава і зрокава адчуваецца набліжэнне лёсавызначальных, неардынарных гістарычных падзей. Уся гэтая патрыярхальная звычайнасць таму і запала ў душу, што была напярэдадні катастрафічных падзей.

Драматызм і трагедыйнасць «Палескай хронікі», зразумела, не адкрыццё. Аб гэтым літаратурныя крытыкі пісалі адразу пасля выхаду другога рамана і прысуджэння І. Мележу Ленінскай прэміі за дылогію аб Палессі. Аднак і сёння гэты кантэкст цыкла раманаў прываблівае даследчыкаў. Усе персанажы «Палескай хронікі» функцыянальныя і пададзены, каб раскрыць вялікую трагедыю праз асабістыя лёсы маленькіх людзей. Таму твор І. Мележа так лёгка набывае сусветнае вымярэнне. Пацвердзім гэта трапнымі словамі знакамітага беларускага навукоўцы і пісьменніка У. Гніламёдава: «Мележаўскія Курані ўвайшлі ў вялікую літаратуру, як Трымячы лог М. Шолахава, Дзівайская воласць (Скрыверы) А. Упіта, Крутыя Лукі С. Залыгіна, Льгоў Тургенева, акруга Йокнапатофа У. Фолкнера, графства Уэсэкс Т. Гардзі. Далёка за межамі Беларусі вядомы мележаўскія Курані, у якіх адлюстраваўся цэлы свет сацыяльных і індывідуальных страсцяў, думак, перажыванняў, шлях беларускага сялянства» [17, с. 212]. Гістарычныя падзеі XX ст., у тым ліку калектывізацыя, дзякуючы асэнсаванню іх І. Мележам менавіта ў духоўным, па-за часавым вымярэнні, набылі сімвалічнае значэнне і гучанне для беларускай мінуўшчыны і сучаснасці. «Палеская хроніка» – жывы твор, незалежна ад нашага сучаснага стаўлення да мінулых падзей, таму што там з вялікім майстэрствам увасоблены непаўторныя лёсы і шматгранныя характары людзей тых нялёгкіх часоў.

Прывядзем прыклад таго, як яшчэ, цяпер ужо з пункту гледжання псіхалогіі характараў, працуе прынцып укаранёнасці ў архітэктоніцы «Палескай хронікі». У канцы другой часткі рамана «Людзі на балоце» аўтарам раскрываецца складанейшы псіхалагічны стан Васіля Дзятла, носьбіта самых запаветных пачуццяў і разваг аўтара. Адбыліся змовіны Ганны з Яўхімам Глушаком. Васіль у душэўным замяшанні ідзе з хаты, і Мележ, каб больш поўна раскрыць пачуцці героя, звяртаецца да ўнутранага маналогу, няўласнапростай мовы: «Калі наплыў гора апаў, прыціх, ён, як бы шукаючы прасветліны, *стараючыся стаць мацней на зямлі* (падкрэслена намі, – *В. У.*), пачаў думаць аб дарагім, запаветным. Не, не ўсё яшчэ кончана! Усё яшчэ будзе!.. Пачакайце, прыйдзе час, пабачыце, хто такі ён, Дзяцел Васіль! Пабачыце, усе пабачыце! Будзе гэта! Будзе яго пара!... Ён узнімецца, пабачыце!.. Гумно снапамі наб’е! Кароў завядзе! Не адну – тры, пяць! Стаенніка завядзе! Такога, што Корч пазялянее ад злосці... Толькі б перадзел

зрабілі! Каб зямлі, ля цягальні!.. Тады ўсе пабачаць Васіля! І яна, Ганна, пабачыць» [18, с. 256]. Выдатна раскрываюцца магчымасці мастацкага слова, літаратуры ў перадачы душэўнага стану героя. Але неўсвядомлены да канца нават самім героем сэнс таго, чаго ён жадае – гэта і ёсць прага ўкаранёнасці ў зямлю, не толькі дзеля дабрабыту, але і дзеля чалавечай годнасці, кахання, гармоніі. Паводле маральнага і духоўнага зместу, паводле агульначалавечага напаўнення, гэты ўнутраны маналог Васіля можа быць супастаўлены з «Быць альбо не быць» знакамітай трагедыі Шэкспіра. Той факт, што там – прынцы крыві і каралі, а тут – людзі на балоце, толькі выразней тлумачаць нацыянальную асаблівасць і непаўторнасць вобліку беларускага Гамлета.

Вялікія творы мастацкай літаратуры, да якіх належыць «Палеская хроніка», тым і адметныя, што іх існаванне ў часе мае пачатак, але не мае канца. Кожная гістарычная эпоха адкрывае ў іх усё новыя грані ва ўвасобленых аўтарамі характарах, падзеях і агульнай архітэктоніцы твора.

На заканчэнне звернем увагу на тое, што ўкаранёнасць як прынцып архітэктонікі «Палескай хронікі» прысутнічае ў І. Мележа ў няяўным выглядзе. Яна іманентна характарызуе самы глыбінны падмурак трылогіі, дзейнічае ў якасці своеасаблівага эстэтычнага «зняцця» аднабаковасці, спрошчанасці патрабаванняў метаду сацыялістычнага рэалізму да літаратуры, толькі ў межах якога аўтар мог тады працаваць. І менавіта дзякуючы гэтаму «зняццю» беларускі пісьменнік здолеў перарасці абмежаванае сацыяльна-гістарычнае напаўненне твора і ўзняцца да пазачасавага анталагічнага асэнсавання быцця беларускага народа падчас складаных сацыяльных катаклізмаў пачатку XX стагоддзя, якія суправаджаліся разбурэннем самых асноў гэтага быцця.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Бугаёў, Дз.* Вернасць прызванню. Творчая індывідуальнасць І. Мележа / Дз. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 239 с.
2. *Юрэвіч, У.* Погляд / У. Юрэвіч. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 223 с.
3. *Куляшоў, Ф.* Іван Мележ / Ф. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1968. – 177 с.
4. *Кулешов, Ф. И.* Подвиг художника : лит. путь И. Мележа / Ф. Кулешов. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Изд-во БГУ, 1982. – 224 с.
5. *Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці пісьменніка : Іван Мележ у школе : дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў / В. Я. Ляшук. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 191 с.
6. *Яскевіч, А. С.* Станаўленне класічнага стылю (на грунце твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа) / А. С. Яскевіч // Полымя. – 2004. – № 9. – С. 206 – 214.
7. *Уткевіч, В. І.* Ідэя ўкаранёнасці ў мастацкім асэнсаванні беларускай літаратурай канца XIX–пачатку XX стагоддзя : манаграфія / В. І. Уткевіч. – Віцебск : УА «ВДТУ», 2014. – 86 с.
8. *Йыгі, О.* Дзесяць год знаёмства з Іванам Мележам / О. Йыгі // Успаміны пра Івана Мележа. – Мінск : Маст. літ., 1982. – С. 215–238.

9. *Адамовіч, А.* Слова пра Івана Мележа / А. Адамовіч // Успаміны пра Івана Мележа. – Мінск : Маст. літ., 1982. – С. 5–16.
10. *Ганчар, А.* Цудоўны пісьменнік і чалавек / А. Ганчар // Успаміны пра Івана Мележа. – Мінск : Маст. літ., 1982. – С. 98–99.
11. *Стральцоў, М.* Пячатка майстра / М. Стральцоў. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 206 с.
12. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979 – 1983. – Т. 8: Жыццёвыя клопаты: артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – 1983. – 686 с.
13. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979 – 1983. – Т. 7: Завеі, снежань : раман з «Палесскай хронікі». – 1983. – 415 с.
14. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979 – 1985. – Т. 5: Людзі на балоце: раман з «Палесскай хронікі». – 1981. – 415 с.
15. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979 – 1985. – Т. 6: Подых навальніцы: раман з «Палесскай хронікі». – 1982. – 415 с.
16. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979 – 1985. – Т. 6: Подых навальніцы : раман з «Палесскай хронікі». – 1982. – 415 с.
17. *Гніламёдаў, У.* Думкі пра Мележа / У. Гніламёдаў // Успаміны пра Івана Мележа. – Мінск : Маст. літ., 1982. – С. 208–214.
18. *Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мıнск : Маст. літ., 1979– 1985. – Т. 5: Людзі на балоце : раман з «Палесскай хронікі». – 1981. – 415 с.

Rootedness as a theoretical category for detecting, among other things, features of national reality is now widely used not only by Belarusian, but also by many foreign scholars. The article presents a specific experience of its use for literary analysis of the cycle of novels "Polesye chronicles" by the renowned Belarusian writer I. Melezh.

*Поступила в редакцию 21.10.15*

**О. Е. Швайликова**

## ИДЕЙНО-ТЕМАТИЧЕСКОЕ И ЖАНРОВОЕ СВОЕОБРАЗИЕ ТРИЛОГИИ «ВОЗРОЖДЕНИЕ» П. БАРКЕР И РОМАНА «И ПЕЛИ ПТИЦЫ…» С. ФОЛКСА

Статья посвящена исследованию основных социальных и морально-этических тем в творчестве П. Баркер и С. Фолкса: классового неравенства в английском обществе начала XX века, положения женщины в обществе, физической и моральной травмы, роли творческой личности во времена социальных потрясений. Исследование тематики произведений проводится на основе элементов сравнительно-сопоставительного и культурно-исторического методов. Отмечается наличие в них признаков исторического, социально-психологического и социально-философского романа.

Имена Пэт Баркер и Себастьяна Фолкса широко известны в современной английской литературе. П. Баркер (р. 1943 г., Торнаби-он-Тис) – автор тринадцати романов, многие из которых переведены на различные языки мира. С появлением трилогии «Возрождение» («Regeneration», 1991; «The Eyeinthe Door», 1993; «The Ghost Road», 1995), повествующей о собы-